Н.М.Хадзінская, *дацэнт*

# ТВОРЧЫЯ ЗАДАННІ ПА КУРСЕ "ГАРМОНІЯ" ЯК ФАКТАР АКТЫВІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ ПАЗНАВАЛЬНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ МУЗЫЧНЫХ СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫЙ

Распрацоўка метадаў выкладання, якія дапамагаюць не толькі перадачы ведаў і навыкаў, але і творчаму развіццю навучэнцаў, з"яўляецца адной з найбольш важных задач сучаснай музычнай педагогікі. Спецыфіка вучэбнай дысцыпліны "Гармонія" дазваляе максімальна развіваць творчыя здольнасці,

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

фантазію, інтэлект студэнта. Арыентацыя на творчасць у навучанні надае гэтаму прадмету значэнне фундаментальнай дысцыпліны, яе глыбокае веданне неабходна як для разумення заканамернасцей музычнага мастацтва, засваення матэрыялу іншых музычных прадметаў, так і для будучай практычнай дзейнасці кіраўніка творчага калектыву, педагога-музыканта. Творчыя заданні і практыкаванні дапамагаюць вырашэнню такіх глабальных задач, як выхаванне творчай асобы, развіццё музыкальнасці, удасканаленне музычнага мыслення, разуменне сутнасці музыкі як віду мастацтва.

Творчыя практыкаванні павышаюць цікавасць навучэнцаў да прадмета і з'яўляюцца адным з самых дзейсных фактараў павышэння пазнавальнай актыўнасці і самастойнасці студэнтаў.

Пошукі новых падыходаў да выкладання гармоніі ў ВНУ прыметна ажывіліся ў 80—90-я гады XX ст. Адным з перспектыўных кірункаў на гэтым шляху даследчыкі (выкладчыкі кансерваторый і музычна-педагагічных ВНУ Расіі, Украіны, Беларусі) лічаць менавіта ўкараненне творчых формаў практычных заданняў і практыкаванняў. На творчасць як фактар інтэнсіфікацыі працэсу навучання і развіцця пазнавальных здольнасцей студэнтаў указваюць Ю.Цюлін, Т.Бершадская, Ю.Халопаў, Ж.Сакольская і інш. Беларускія выкладчыкі ВНУ ўносяць каштоўны ўклад у распрацоўку творчых заданняў і практыкаванняў, у прыватнасці, можна назваць вучэбна-метадычны дапаможнік Н.Бабчанок "Творчыя заданні ў інтэграваным курсе гармоніі і сальфеджыо" (Мн., 1999).

На кафедры тэорыі музыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры таксама вядзецца работа ў гэтым накірунку. Выкарыстанню творчых метадаў на занятках па гармоніі перашкаджае многае. Па-першае, гэта розны, часта даволі нізкі ўзровень музычна-тэарэтычных ведаў студэнтаў, многія з якіх, асабліва на спецыялізацыі эстраднага мастацтва,

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

увогуле не вывучалі гармоніі. Неабходнасць запоўніць прабелы ў ведах студэнтаў вымушае звяртацца да даволі элементарных відаў работы. Па-другое, вялікая колькасць студэнтаў у групе, адсутнасць індывідуальных заняткаў зніжаюць ступень уздзеяння выкладчыка на асобу студэнта (у параўнанні з такой магчымасцю на занятках па дырыжыраванні, спецінструменце і інш.). Нарэшце, здараецца і так, што прапановы выкладчыкаў сустракаюць негатыўнае стаўленне да іх саміх студэнтаў, якія прывыклі да стэрэатыпных практыкаванняў па гармоніі ў вучылішчах. Таму галоўнай задачай выкладчыка гармоніі становіцца выпрацоўка ў студэнтаў станоўчых адносін да творчых відаў работы, пераадольванне шаблоннага характару многіх традыцыйных практыкаванняў.

Падзел заданняў на творчыя і нятворчыя ўмоўнае, бо элемент творчасці павінен прысутнічаць пры выкананні любога музычнага практыкавання. Праўда, творчыя заданні адрозніваюцца больш значнай свабодай і фантазіяй у выбары сродкаў і прыёмаў іх выканання ў адрозненне ад практыкаванняў, якія маюць вузка пастаўленыя мэты і строга рэгламентаваны.

Выкананне творчых заданняў звычайна залежыць ад творчых магчымасцей кожнага навучэнца. Таму якасць іх выканання іншы раз рэзка адрозніваецца ад якасці выканання практыкаванняў, дзе недахоп творчых здольнасцей так відавочна не праяўляецца. Творчыя заданні дапамагаюць выкладчыку выявіць творчыя асобы, якія зусім не "блішчалі" ў строгіх рэгламентаваных вучэбных практыкаваннях. Студэнты, надзеленыя творчымі задаткамі, але не маючыя сістэматычных ведаў і навыкаў і таму абыякавыя да прадмета, паступова страчваюць гэтую абыякавасць; іх цікавасць да гармоніі ўзрастае, і яны пачынаюць разумець тыя яе ўласцівасці, якія былі "схаваны" ад іх за знешняй сухасцю і акадэмічнасцю звычайных відаў работы па гэтым прадмеце.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Здольнасці студэнтаў павінны ўлічвацца пры даручэнні ім творчых заданняў. Таму выкладчык павінен у адных выпадках абмяжоўваць заданне, даваць навучэнцу пэўныя арыенціры, падказваць шляхі вырашэння, а ў другіх — даваць як мага больш свабоды, кіраваць выкананнем задання толькі ў самым агульным плане.

Узровень творчасці ў практыкаваннях па гармоніі, безумоўна, як мы ўжо адзначалі, залежыць і ад папярэдняй падрыхтоўкі студэнцкай групы, і не ў апошнюю чаргу ад спецыялізацыі. Шматгадовы вопыт выкладчыцкай работы ва універсітэце культуры паказаў, што найбольшай успрымальнасцю, гібкасцю мыслення, што з'яўляецца вельмі важнай умовай для развіцця творчага пачатку, валодаюць студэнты харавой (акадэмічнай) і народна-інструментальнай спецыялізацый. Большая частка навучэнцаў духавой і народна-харавой спецыялізацый адчуваюць цяжкасці ў гэтым і неахвотна ўспрымаюць увядзенне элементаў творчасці ў практыкаванні па гармоніі. Надзвычай розная падрыхтоўка студэнтаў эстраднай спецыялізацыі таксама ставіць выкладчыка ў складанае становішча і патрабуе індывідуальнага падыходу пры вызначэнні ступені творчасці ў прапанаваных заданнях.

Некалькі слоў аб саміх творчых заданнях.

Вялікае поле дзейнасці творчага характару адкрывае для студэнтаў вывучэнне меладычнай, гарманічнай і іншых відаў фігурацыі.

"Ажыўленне" меладычнага пачатку ў галасах звычайнай чатырохгалоснай фактуры пры ігры нават нескладаных секвенцый, кадэнцый і іншых гарманічных пабудоў надае гэтым добра знаёмым для студэнтаў відам дзейнасці рысы мастацкасці, набліжае іх да "жывой" музыкі.

Прапануецца сачыненне мелодыі да дадзенай гарманічнай фактуры з выкарыстаннем розных відаў неакордавых гукаў. Стварэнне ўласнага музычнага тэксту дае магчымасць

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

глыбокага пранікнення ў заканамернасці развіцця мелодыі, разумення яе глыбокай сувязі з гармоніяй.

Творчую актыўнасць студэнтаў стымулююць пісьмовае сачыненне аб суправаджэнні да мелодыі, падбор акампенементу на фартэпіяна. Апошні від работы лічым адным з найбольш карысных і таму неабходным на занятках па гармоніі. Ён дапамагае вырашыць дзве мэты: "выцягненне" са слыхавой памяці студэнтаў правільных гармоній (прапануюцца знаёмыя рамансы і песні); адпаведную фактурную апрацоўку знойдзеных гармоній, гэта значыць падбор неабходнага віду фігурацыі, пры выкананні якой патрабуецца вытрымаць усе правілы спалучэння і вырашэння акордаў. Такім чынам, у "жывой" форме вывучаюцца асноўныя заканамернасці гарманічнага чатырохгалосся.

Наступны этап — напісанне фактурных і жанравых варыяцый на мелодыі гарманічнай задачы, народнай песні, пераўтварэнне харальнага складу ў пабудовы з рысамі розных жанраў (народнай песні, бытавых танцаў, марша, раманса і інш.).

Метад стылізацыі пэўнай кампазітарскай манеры ці стылявога накірунку патрабуе карпатлівай дэталёвай падрыхтоўкі — уважлівага аналізу канкрэтнага стылю, аб"екта стылізацыі. Падыходам да гэтага складанага віду работы можа быць наступнае практыкаванне: давядзенне прапанаваных невялікіх урыўкаў да поўнага перыяду з захаваннем віду фактуры, тыпаў неакордавых гукаў і інш.

З усіх відаў заданняў больш за ўсё творчасці патрабуе стылізацыя. У курсе гармоніі ва універсітэце ўвогуле не разглядаюцца індывідуальныя кампазітарскія гарманічныя стылі; пытанні стыля асвятляюцца пры знаёмстве з той або іншай эпохай у музычным жыцці. Таму практычнае праламленне агульных эпахальных прынцыпаў і рыс у канкрэтнай кампазітарскай манеры надзвычай карысна для

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

пранікнення ў сутнасць стылявой гармоніі. Работы па стылізацыі павінны быць невялікімі і ставіць перад сабой канкрэтную мэту, што дазволіць пазбегнуць стварэння маламастацкіх "вырабаў". Лепш за ўсё пачынаць з узнаўлення сродкаў канкрэтнага твора. Старанны аналіз структуры і функцый акордаў, характэрных паслядоўнасцей, галасавядзення, фактуры, меладычных, рытмічных малюнкаў і іншых асаблівасцей дадзенага ўзору дае магчымасць студэнту ўсвядомлена выкарыстоўваць тыя ці іншыя сродкі.

Зразумела, спробы стылізацыі прапануюцца ў добра падрыхтаваных групах. У іншых робіцца толькі падыход да гэтай найцікавейшай работы ў выглядзе дасачынення прапанаванай пабудовы (пачаткаў перыядаў з тых твораў, якія маюць найбольш выдавочныя тып фігурацыі, акордыку і меладычную лінію) да поўнага перыяду.

Студэнт універсітэта павінен авалодаць таксама ўменнямі імправізаваць мелодыю на фоне акордавай паслядоўнасці, сачыняць басовы голас да прапанаванай двухгалоснай песні, рабіць чатырохгалоснае пералажэнне двухгалосных твораў, афармляць фактурна дадзеную мелодыю, зыходзячы з яе жанравых асаблівасцей, рабіць уступ да песні, раманса, іграць мадуліруючы перыяд у жанры вальса, полькі, мазуркі і інш.

Усе гэтыя віды работы спрыяюць развіццю і ўдасканаленню вынаходлівасці, фантазіі, творчай актыўнасці навучэнцаў і тым самым эфектыўна ўплываюць на актывізацыю самастойнай пазнавальнай работы студэнтаў музычных спецыялізацый універсітэта культуры.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ